# Сэнс выгн[аньня]

Ф[элікс] разглядае справу выгн[аньня] з Бел[арусі] інтэл[ігенцыі] як вызначэньне адмоўнага дачыненьня кір[уючай] п[артыі] да зьявы **нац[ыянальнага]** росту краю, да росту бел[арусаў] як нацыі. І таму сама справа гэта ёсьць падразаньне гэтага росту. (Няўжо–ж гэтая куч[ка] была „ростам“? Не. Яна была **крыніцаю** ідэй, варожых ідэям пролет[арыяту].) Што вызнач[эньне] дачын[еньня] — гэта так. Адмоўн[ае] — таксама так. Да якой толькі зьявы? Якою зьяваю **была** ці **магла** быць выг[наная] гр[амада]? Асабліва пры ўскладнен[ых] міжн[ародных] сытуацыях (у вып[адку] вайны). Гэта было **аграджэньне сябе** ад небясьпе[кі] маючай быць, гэта на ўсякі выпадак. Гэта **абязьвінавачаньне** сябе перад людз[ьмі]. Гэта перанясеньне віны з хворай на здар[овы] голаў. Гэта стварэньне **аб’екту для выхаду народн[ага] гневу**, гэта стварэньне **адводнага каналу** для нар[однага] нездав[альненьня]. Гэта **абяленьне сябе**. Гэта **паказваньне** сябе дзейнымі, клапатлівымі, рупатлівымі абаронцамі інтар[эсаў] мас. Гэта **нажываньне пал[ітычнага] капіт[алу]** сабе. Гэта **падняцьце сваіх акцый**, гэта **камп[анія]** за сябе, гэта **камп[анія] за падняцьце акцый свай[го]** нацпал[ажэньня]. Гэта начасны манэўр, начасны **ход**. Гэта і **ачышч[эньне] срэды** ад небясь[печных] эл[емэнтаў], ад **небясьп[ечных] уплываў**.

З нашага гл[едзішча] гэта быў або акт чалавека, перапалох[анага] сваёю цэнт[ральнасьцю], акт чалав[ека], страціўшагася (растерявшегося) у даным станові[шчы], або акт праяўлен[ьня] самаст[ойнасьці] пал[ажэньня], акт праяўл[еньня] самабытнасьці ў пал[ажэньні], вяр[таньне] пісарскай паліт[ыкі]. Гэта акт або **перапуджанага** перад твар[ам] буд[учыні], або **кар’ерыста** і **авантурніка**. Рабілі–ж бо мясцовыя. Цэнтр даваў дырэктывы па дакладах мясцов[ых], па мясцовых прадстаўленьнях. За што–ж бо і „одернули“ іх, калі–б было інакш. (Або за тое, што ня гладка зрабілі, або за тое, што няправіль[на] прадст[авілі] справу…)

Адзін[ае] усіх выгн[аньнікаў] — гэта тое, што яны краявая інтэліг[енцыя], што гэта нацыянальн[ая] інтэл[ігенцыя], якіх–бы пол[ітычных] кірунк[аў] яна ні была. Яны могуць [быць] варожым[і] між сабою, могуць быць нат супярэчн[ымі]. Але яны адзіны ў нацыі. От у чым істасьць.

Ненавісьць гэтая, а для некаторых **забавы** дзеля таксама прычыніліся ў выгн[аньні].

*[1933]*